


# Гродзенскі Універсітэт

ГАЗЕТА ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

Выдаецца з 1986 года ● № 10 (281) ● *3 лістапада 2000 года, пятніца*

Выходзіць адзін раз на месяц ● Распаўсюджваецца бясплатна


## ВЫБОРЫ СОСТОЯЛИСЬ

По данным Центризбиркома во втором туре голосования в среднем по республике приняли участие 52,6 процента избирателей. Главная особенность — при «пороге» явки в 25 процентов на участки пришло в два раза больше избирателей. Активное участие в голосовании приняли и наши студенты, проживающие в общежитиях. Так, во втором туре проголосовали 54 процента избирателей, а в первом — около 72 процентов. Это — ответ идеологам «бойкота».

Избиратели активно и недвусмысленно проголосовали за будущую законодательную власть. Палата представителей законодательного собрания сформирована.

## ВСТРЕЧА У РЕКТОРА



*Ректор университета профессор С.А.Маскевич лично поздравил с наградами заслуженных работников образования. Это было после заседания октябрьского Совета университета.*

***На неформальную встречу у ректора пришли ученые, получившие звания и награды государства за свой труд, руководители, члены ректората. Были приглашены заслуженные работники образования РБ профессоры И.П.Мартынов, И.П.Крень, заслуженный деятель науки РБ профессор С.В.Кондратьева, заслуженный работник физической культуры помощник ректора В.М.Карчевский, награжденные медалью «Франциска Скорины» профессор В.Н.Черепица, медалью «За трудовые заслуги» — профессор Л.В.Кирилюк.***

*НА СНИМКЕ: Встреча у ректора.*

**Фото Людмилы ВОЙДА.**

## САВЕТ УНІВЕРСІТЭТА

Прайшло чарговае пасяджэнне савета універсітэта, на якім прынята новая рэдакцыя Статута Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы, а таксама «Праграма выхаваўчай работы са студэнтамі».

У раздзеле «рознае» былі разгледжаны надзённыя пытанні.

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ


- **Сацыяльная праграма развіцця ў дзеянні**
- *17 лістапада — Дзень студэнтаў*
- ***Вучымся пісаць рэцэнзіі***
- Спартыўны калейдаскоп


# ИНФОРМАЦИЯ • НОВОСТИ • СОБЫТИЯ • ФАКТЫ

## ПРОГРАММА «ЖИЛЬЁ»

В новых квартирах еще долго будет витать запах краски, еще долго будут выявляться недоделки строителей. Но это не смущает новоселов: были бы стены, а главное — ордер. Остальное — в собственных руках.

Полностью взял на себя расходы университет на строительство квартир для доцента кафедры русского языка и зарубежной литературы Т.Г.Семиной, заведующего кафедрой изобразительного искусства А.А.Лещинского, старшего преподавателя кафедры теории и методики физической культуры Ю.Н.Чудакова, доцента кафедры спортивной медицины и лечебной физкультуры И.П.Сенина. Их семьи нынче справили новоселья.

***

В рамках программы «Жилье» расширят свои «метры» ведущие специалисты университета — доцент кафедры экономической теории Ф.Б.Марголин, доцент кафедры прикладной математики Е.А.Ситько, заведующий кафедрой всеобщей истории А.Н.Нечухрин, доцент кафедры всеобщей истории Г.В.Васюк. На строительство жилья для их семей университет выделил безвозмездно по 25 заработных плат и выдал кредиты на сумму 1400 минималок каждому.

***

Заключен договор на строительство квартиры для приглашенного на работу в университет доктора педагогических наук, профессора В.Т.Чепикова.

## ЦИТАТА НОМЕРА:

**«Никто не может быть ни всезнающим, ни всемогущим». Вергилий.**

## ВІНШАВАЛЬНАЯ ПАШТОЎКА

**Рэктарат, прафком, савет ветэранаў віншуюць з юбілеем і жадаюць моцнага здароўя, шчасця, дабрабыту, поспехаў юбілярам. Нагадваем, калі і каго можна павіншаваць.**

* 3 лістапада - **Вадзіма Рыгоравіча РОДЧАНКУ** - старшага выкладчыка кафедры інфарматыкі і вылічальнай тэхнікі.
* 5 лістапада - **Рэгіну Іванаўну ТАРАН** - старшага выкладчыка кафедры педагогікі.
* 7 лістапада - **Людмілу Уладзіміраўну КРОПАЧАВУ** - дацэнта кафедры радыёфізікі і электронікі.
* 9 лістапада - **Марыю Валер'еўну ВЕКЕРАВУ** - прыбіральшчыцу навучальнага корпуса №2.
* 10 лістапада - **Юрыя Альфрэдавіча ВАЙТУКЕВІЧА** - начальніка аддзела замежных сувязяў.
* 20 лістапада - **Валянціна Аляксандравіча ДЗЕНІСЕНКУ** - дацэнта кафедры біяхіміі і біятэхналогіі.
* 21 лістапада - **Алега Ільіча ПЯТРОВА** - лабаранта II катэгорыі кафедры агульнай фізікі.
* 27 лістапада - **Святлану Аляксееўну ФІЛАТАВУ** - лабаранта I катэгорыі факультэта эканомікі і кіравання.
* 27 лістапада - **Аліцыю Іванаўну ЗАМАН** - старшага інспектара аддзела кадраў.
* 27 лістапада - **Аляксея Ільіча ДЗЮБУ** - рабочага інтэрната № 4.

## ВІНШУЕМ!

Сардэчна віншуем з юбілеем ветэранаў: Любоў Дзянісаўну Клімаву, Раісу Іосіфаўну Ціхановіч, Соф'ю Абрамаўну Памеранц, Тацццяну Аляксандраўну Альсмік, Вольгу Максімаўну Карпенка.

Моцнага Вам здароўя, шчасця, даўгалецця!

*Савет ветэранаў.*

# ИНФОРМАЦИЯ • НОВОСТИ • СОБЫТИЯ • ФАКТЫ

## СЕМЬ КВАРТИР

Университет участвует в строительстве 7 квартир для преподавателей. Однако с мая строительство подорожало на 53 процента.

## ЗАЙДИТЕ В ИНФОБАНК!

Университет заключил договор с Инфобанком на перечисление заработной платы сотрудникам и стипендии студентам. К сожалению, не все сотрудники перешли на цивилизованное обслуживание. Некоторые предпочитают многочасовое стояние в очереди перед кассой. А зря. Как свидетельствуют те, кто завел счет в банке, это очень удобно.

- Никакой очереди, никаких потерь времени, - говорит помощник ректора В.М.Карчевский. — Странно, что люди не понимают своей выгоды...

- Это удобно и эффективно, - считает ученый секретарь университета Т.К.Комарова. — Обслуживание культурное, все происходит быстро. А очередь у кассы —это унизительно...

Добавим, что средства, полученные от банковских процентов, пойдут на оказание материальной помощи ветеранам университета. А Вы уверены, что не станете таковыми?

## КОНКУРС ПЕРВОКУРСНИКОВ

Завершился традиционный конкурс первокурсников «Альма-матер — любовь с первого курса!?» Первокурсники показали все, что они могут в рамках сценического искусства, пении, танцах. Были представлены буквально все жанры. Лучшие номера жюри отобрало для того, чтобы после соответствующей режиссерской обработки включить в концерт, посвященный Международному дню студента. Напомним, он отмечается 17 ноября. Самые-самые из числа первокурсников будут приглашены в команды КВН и СТЭМ.

## ЮБИЛЕЙ

Недавно председатель профкома студентов Александр Гринь вернулся из Москвы, где принимал участие в торжественных праздничных мероприятиях, посвященных 10-летию студенческого Союза МГУ.

Программа торжеств была насыщенной и интересной. Здесь были и встречи руководителей студенческих организаций разных лет, и спортивно-массовые мероприятия, и праздничные концерты, фестивали команд КВН МГУ и вузов Москвы, юбилейная лотерея, дискотека и праздничное шоу.

Достаточно широкое представительство гостей — из России, Норвегии, Эстонии, Швеции, Италии, Румынии, Польши, Армении. В том числе — и из Гродно. Кстати, у нашего студенческого профкома давние деловые контакты с МГУ. На студенческом уровне сотрудничество идет по многим параметрам.

## СНИТСЯ ЧЕРНОЕ МОРЕ

Здорово отдохнули нынче многие сотрудники нашего университета — 51 человек оздоровился на Черном море. Некоторые — с членами своих семей, а кое-кто — с коллегами. Так, только из коллектива библиотеки одновременно отдыхали 5 сотрудников.

Казалось бы, по нынешним временам такое нереально по финансовым соображениям. Но это стало возможным благодаря тому, что наш университет заключил договор с Одесским университетом. Одним из пунктов договора является организация отдыха на базе Одесского университета — оздоровительном учреждении «Черноморка».

Наши сотрудники отдыхали 12 дней. Море, солнце плюс трехразовое питание — что еще нужно для отдыха?! К тому же профком возместил затраты на дорогу в сумме по 30 тысяч рублей каждому. Стоимость такой путевки — 40 у.е. Выгодно. Поскольку аналогичная путевка на озеро Свитязь стоила этим летом 70 у.е.

## КАНФЕРЭНЦЫЯ ПРАЦОЎНАГА КАЛЕКТЫВУ

25 верасня адбылася прафсаюзная канферэнцыя працоўнага калектыву універсітэта. На парадку дня былі наступныя пытанні: аб выкананні калектыўнага дагавору і фінансаванні праграмы «Жыллё» і «Рознае». З інфармацыяй па першым пытанні выступіў старшыня прафкома выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта У.А.Хілюта.

- Па асноўных напрамках выкананне калектыўнага дагавору ідзе паспяхова, - паведаміў У.А.Хілюта. - Працавалі ў цесным кантакце з адміністрацыяй і саветам ветэранаў. Не было затрымак заработнай платы. Калектыў атрымліваў прэміі. Дзякуючы намаганням адміністрацыі, фінансаванне стабільнае. Сёлета ўдалося аздаравіць значную колькасць нашых супрацоўнікаў. На пабярэжжы Чорнага мора адпачываў 51 чалавек.

Далей старшыня прафкома спыніўся на асобных пунктах выканання калектыўнага дагавору.

З інфармацыяй аб фінансаванні праграмы «Жыллё» выступіў першы прарэктар па навучальна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях І.П.Мартынаў. Ён паведаміў, што 15 мільёнаў рублёў, выдаткаваныя на фінансаванне гэтай праграмы, паспяхова асвоены. Дадаткова плануецца выдзеліць яшчэ 20 мільёнаў рублёў.

У раздзеле «Рознае» былі разгледжаны змяненні ў складзе жыллёвай камісіі. У яе ўведзена намеснік галоўнага бухгалтара універсітэта Т.А.Герашчанка. Таксама была размеркавана трохпакаёвая кватэра, выдзеленая Кастрычніцкім райвыканкомам па просьбе універсітэта. У калектыўным дагаворы запісана, што выкладчыкам, якія маюць заслугі, універсітэт можа выдзеліць кватэру, якую можна выкупіць па сабекошце па-за чаргой. Была ўнесена прапанова: кандыдатура дэкана матэматычнага факультэта В.К.Бойкі. Ён працуе ва універсітэце з 1971 года, мае ўзнагароды, граматы, пражывае з сям'ёй з 4-х чалавек у двухпакаёвай кватэры. Канферэнцыя працоўнага калектыву падтрымала гэтую прапанову.

# СЕМІНАР «МАТЭМАТЫЧНАЯ АДУКАЦЫЯ»

У 1999/2000 навучальным годзе на матэматычным факультэце Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы працягваў сваю працу навукова-метадычны семінар «Матэматычная адукацыя» пад кіраўніцтвам прафесараў І.П.Мартынава, А.А.Пякарскага і дацэнта Ю.П.Залатухіна. Адбылося восем пасяджэнняў семінара, на якіх былі заслуханы і абмеркаваны наступныя даклады і паведамленні:

**21 верасня 1999 г.** Ян Кремпа (прафесар Інстытута матэматыкі Варшаўскага універсітэта). Аб некаторых сувязях тэорыі лікаў з алгебрай.

Агнешка Саковіч (асістэнт Інстытута матэматыкі Беластоцкага універсітэта). Канечныя групы з глабальна перастановачнымі рашоткамі падгруп.

**20 кастрычніка 1999 г.** Ю.П.Залатухін, Н.Л.Ражко, Л.У.Рудзікава, С.Л.Сабалеўскі. Матэматычная адукацыя і даследаванні па матэматыцы ў Гродзенскім педагагічным інстытуце (1944-1978). Частка 1.

**17 лістапада 1999 г.** Ю.П.Залатухін, Н.Л.Ражко, Л.У.Рудзікава, С.Л.Сабалеўскі. Матэматычная адукацыя і даследаванні па матэматыцы ў Гродзенскім педагагічным інстытуце (1944-1978). Частка 2.

**22 снежня 1999 г.** Ю.П.Залатухін, Л.У.Кірылюк, І.М.Сцяпура, С.Л.Сабалеўскі. Аб структуры і змесце падрыхтоўкі магістрантаў па спецыяльнасці 13.00.02 - Тэорыя і методыка навучання матэматыцы.

**19 студзеня 2000 г.** Ю.П.Залатухін, Н.Л.Ражко, Л.У.Рудзікава, С.Л.Сабалеўскі. Матэматычная адукацыя і даследаванні па матэматыцы ў Гродзенскім педагагічным інстытуце (1944-1978). Частка 3.

**15 сакавіка 2000 г.** І.М.Сцяпура. Развіццё сярэдняй алгебраічнай адукацыі ў Расіі ў 1890-1941 гг.

**19 красавіка 2000 г.** М.У.Касперка (метадыст Гродзенскага ІПК кіруючых работнікаў і спецыялістаў адукацыі). Інавацыйная дзейнасць як умова развіцця інтэлектуальна-крэатыўнага патэнцыялу будучага педагога.

**8 чэрвеня 2000 г.** А.А.Грынь. Развіццё метада дапаможных функцый Дюлака для якаснага даследавання палінаміяльных аўтаномных сістэм на плоскасці.

У працы семінара знайшла адлюстраванне падрыхтоўка да святкавання 60-годдзя Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы, якое адбылося 3-4 сакавіка 2000 года.

У 2000/2001 навучальным годзе семінар працягвае работу. Пасяджэнні праводзяцца кожную трэцюю сераду месяца. Запрашаем настаўнікаў, метадыстаў, выкладчыкаў вышэйшай школы, усіх, хто цікавіцца праблемамі матэматычнай адукацыі, прыняць удзел у яго рабоце.

Кантактны тэлефон 44-34-87 (кафедра алгебры, геаметрыі і методыкі выкладання матэматыкі).

**С.ЛЫТНЕЎ,**
**начальнік навучальна-метадычнага аддзела.**

## *ПЕРЛЫ ИЗ СОЧИНЕНИЙ АБИТУРИЕНТОВ*

Анна Каренина бросилась под поезд, и он долго влачил ее жалкое существование.

Анна сошлась с Вронским совсем новым, неприемлемым для страны способом.

Бедная Лиза рвала цветы и этим кормила свою мать.

В Горячем Логе Давыдов быстро разобрался в окружающей обстановке - везде царила монархия.

В Италии Гоголь отдыхал от ревизоров.

В клетке сидит мой пернатый друг - хомячок.

В фамусовском обществе слышались не только французские слова, но и нижегородские.

Вася приобрел себе собаку, когда он был еще щенком.

Вдруг я услышал лай собаки. Это были охотники.

Вот проехал автобус, увозя за собой пассажиров.

Выбросив княжну Мэри за борт в набежавшую толпу, Степан Разин стал морально устойчивым и вернул себе доверие избирателей.

Гамлет сумел притвориться умалишенным, а Офелия не сумела.

*ИГРАЕМ В ПСИХОЛОГИЧЕСКИЕ ИГРЫ*

# «КАПИТАН? РУЛЕВОЙ? ПАССАЖИР?»

Для определения характера выбора, который каждый из нас делает в той или ной жизненной ситуации и позиции, занимаемой в общении, ведущий предлагает учиться ответить «да» или «нет» на каждый из 15 нижеприведенных вопросов.

1. Я всегда чувствую ответственность за все, что случается в моей жизни.
2. В моей жизни не было бы столько проблем, если бы некоторые люди изменили свое отношение ко мне.
3. Я предпочитаю действовать, а не размышлять над причинами своих неудач.
4. Иногда мне кажется, что я родилась (ся) под «несчастливой» звездой.
5. Я считаю, что алкоголики виноваты в своей болезни.
6. Иногда я думаю, что за многое в моей жизни ответственны те люди, под влиянием которых я стал (а) таким (ой), как я есть.
7. Если я простужаюсь, то предпочитаю лечиться самостоятельно, не прибегая к помощи врача.
8. Во вздорности и агрессивности, которые так неприятны в человеке, чаще всего виноваты другие люди.
9. Считаю, что любую проблему можно решить, и не очень понимаю тех, у кого вечно возникают какие-то жизненные трудности.
10. Я люблю помогать людям, потому что чувствую благодарность за то, что другие сделали для меня.
11. Если начинается конфликт, то, размышляя, кто в нем виноват, я обычно начинаю с себя.
12. Если черная кошка перейдет дорогу мне, я перехожу на другую сторону.
13. Каждый человек независимо от обстоятельств должен быть сильным и самостоятельным.
14. Я знаю свои недостатки, но хочу, чтобы окружающие относились к ним снисходительно.
15. Обычно мирюсь с ситуацией, повлиять на которую не в состоянии.

**Методика подсчета результатов:** за каждый ответ «да» на вопросы 1,3,5,7,9,11,13 и ответ «нет» на вопросы 2,4,6,8,10,12,14,15 поставьте по 10 баллов. За ответы «не знаю» - по 5 баллов. Подсчитайте общее количество баллов. На основе этого каждый член клуба сможет ориентировочно определить свою роль и позицию в общении, стратегию работы над собой.

100-150 баллов. Вы капитан собственной жизни. Вы чувствуете ответственность за все, что с вами происходит, многое берете на себя, преодолевая трудности, не преувеличивая их. Вы видите перед собой задачу и думаете над тем, как ее можно решить. Что при этом вы чувствуете, что происходит в вашей душе - для окружающих загадка.

50-99 баллов. Вы охотно бываете рулевым, но можете, если это необходимо, передать штурвал в верные руки. При оценке причин собственных трудностей вы вполне реалистичны. Гибкость, рассудительность и чуткость всегда бывают вашими союзниками. Случаются ситуации, которые вас никак не касаются, вы не несете за них никакой ответственности и, тем не менее, если это требуется, все-таки берете ответственность на себя. Вы умеете жить в добром согласии с другими людьми, не нарушая внутреннего согласия с самим собой.

До 49 баллов. Вы часто бываете пассажиром в своей жизни, легко подчиняясь обстоятельствам. В своих трудностях обвиняете кого угодно, только не себя. Настоящая независимость кажется вам недостижимой и невозможной. Тем не менее, вы умеете мирно сосуществовать с другими, не вдаваясь в подробности, что это за люди и как они относятся к вам.

Участники встречи обмениваются впечатлениями.

До 49 баллов. Вы часто бываете пассажиром в своей жизни, легко подчиняясь обстоятельствам. В своих трудностях обвиняете кого угодно, только не себя. Настоящая независимость кажется вам недостижимой и невозможной. Тем не менее, вы умеете мирно сосуществовать с другими, не вдаваясь в подробности, что это за люди и как они относятся к вам.

В заключение, как обычно, участники встречи обмениваются впечатлениями.

# ФІЛАСАФІЧНАСЦЬ І МАСТАЦКАСЦЬ ПАЭМЫ «ЗЯЗЮЛЯ» С.ЗАКОННІКАВА

**Жана КОТАВА,**
**студэнтка 4 курса**
**філалагічнага факультэта**

Шэраг надзённых праблем рэчаіснасці склалі змест паэмы, уяўляючы сабой крык зварот да сучасніка ў да абуджэння ад рабскага сну. Пра гэта - «Чорная быль», пра гэта - «Зязюля» С.Законнікава.

Гэтыя два творы, на мой погляд, варта разглядаць у параўнанні. Абодва творы, знітаваныя адзінаю тэмай, з'яўляюцца ў той жа час рознымі ў яе адлюстраванні.

Галоўным стрыжнем, на першы погляд, у абодвух творах з'яўляецца чарнобыльскае гучанне. «Чорная быль» - гэта хроніка той жудаснай падзеі і яе наступстваў. Апранутая ў мастацкую форму разам з «Зязюляй», яна адлюстроўвае самую змрочную старонку гісторыі нашага часу. У абедзвюх паэмах чарнобыльская тэма вельмі цесна пераплятаецца як агульнымі праблемамі, вобразамі, так і мастацкімі сродкамі.

Вы бачылі калі-небудзь забітыя вокны ці лес, абнесены дротам? Ведаеце, што за ім? Нават самая старэнькая непісьменная палеская бабуля адкажа, што там радыяцыя. Гэтая нябачная і неўспрымальная з'ява прымусіла пакінуць родныя хаты, радзіму дзяцінства, прымусіла забіць вокны і абнесці дротам лес. З'ява, народжаная чарнобыльскім выбухам, напоўніла анкалагічныя аддзяленні шпіталяў.

*Той вечар быў уражаннямі поўны,*
*зтэатра мы ішлі дамоў памалу.*
*І хмарка, што насоўвалася з поўдня,*
*Гурт гаманлівы наш не турбавала,*

нагадвае С.Законнікаў у раздзеле «Выбух» з «Чорнай былі». А гэта быў выбух, выбух атамны, затым - сацыяльны. Пра гэта ўжо ведала Еўропа, а на Беларусі - зона маўчання. З надзеяй чакалі, калі ўсё растлумачыць Масква, у той час, як кіраўніцкія лімузіны пакідалі Кіеў. Аднак цяпер відавочным стаў вынік: зона маўчання ператварылася ў агароджаную зону, дзе

*Трава залетавала без касы...*
*Поле без коласа...*
*Хаты без людзей...*
*Печы без агню...*
*Калодзежы без вады...*
*Палыном зараслі сады...*
***(«Зязюля»)***

Аўтар ставіць бюракратаў перад адказнасцю, не шкадуючы мастацкіх сродкаў для адлюстравання здрадніцтва. Перш за ўсё гэта сарказм у паказе ілжывасці чыноўнікаў пры ўладзе.

У «Чорнай былі» з публіцыстычнай завостранасцю адлюстравана супярэчнасць, складанасць, боль Чарнобыльскай рэчаіснасці. Вобразы палескай бабулі і старога палешука - увасабленне трагічнага лёсу беларускага народа, выгнанага з абжытых гнёздаў. Нябачная і незразумелая ім радыяцыя не можа выгнаць іх з роднай хаты. Калючы дрот для іх - не перашкода. Яны вяртаюцца, каб знайсці тут спакой, вечны спакой у роднай зямлі. І зноў жа тут заўважаем сувязь з «Зязюляй».

*Хоць у бары зязюльчын голас змоўк,*
*Перасяленцы - мёртвыя, жывыя -*
*Вяртаюцца, вяртаюцца дамоў...*
***(«Чорная быль»)***

Далей у вобразнай сістэме «Чорнай былі» неабходна вылучыць вобразы палескіх дзяцей. Напэўна, гэтыя вобразы больш за ўсё кранаюць за самае жывое і перадаюць трагічныя наступствы Чарнобыля: невылечныя анкалагічныя захворванні беларускіх дзетак. Цяпер не ў лагеры ім праводзіць канікулы і лета, іх чакае «санаторый пад Мінскам у лесе». Так, сумна вядомыя Бараўляны сталі «прытулкам палескіх дзяцей» - «перапёлачак Беларусі». Раздзел «Чаравічкі» магутнай сілай уздзеяння скіраваны супраць нашай недаравальнай бестурботнасці.

З кожным крокам узрастае шырыня інтарэсаў паэта, яго майстэрства, уменне засяродзіць нашую ўвагу на самых розных імгненнях жыцця. «Зязюля», якая шырэйшая па ахопе праблем рэчаіснасці, як прыклад таму. Па-мастацку паэт у гэтым творы з чарнобыльскім гучаннем звязаў шэраг маральных і духоўных тэм, надзённых і актуальных для сучаснасці. Імкненне пранікнуць і спасцігнуць супярэчнасці развіцця навакольнай рэчаіснасці ўзбагачаюць філасофскі бок творчасці Законнікава. Любоў, дабрыня, надзея, вера, праўда і іншыя філасофска-этычныя катэгорыі актыўна выкарыстоўваюцца Законнікавым для асэнсавання шматлікіх праяў чалавечай дзейнасці.

У народзе кажуць, што бяда ніколі не прыходзіць адна. За страшэнным выбухам трагедыяй для Беларусі сталася страта яе духоўных і маральных каштоўнасцяў. Хіба не бяда, што народ забывае мову? Як гэта ні прыкра, аднак з болем усведамляем, што прарочыя словы Багушэвіча становяцца рэальнасцю. Існуе рэальная пагроза знікнуць маленькай Беларусі з карты сусвету, згубіцца на гэтай вялікай планеце.

Філасофскія разважанні над сэнсам жыцця, над сутнасцю паняццяў «народ», «нацыя», урэшце, што ёсць «мы», дзякуючы паэтычнаму майстэрству, становяцца даступнымі чытачу. Прычым у сваіх разважаннях паэт імкнецца дайсці да сутнасці праблем, разабрацца ў іх складанасці. Хто мы? Што мы? Народ, за плячыма якога стагоддзі прыгнёту і няволі, які пераадолеі «воіны і змагары, народ, які, маючы ўсё, не спяшаецца да самавызначэння, а, можа, урэшце гатовы ўпасці ў гэту праклятую бездань. І не трэба вінаваціць у тым менталітэт. Памяркоўнасць - гэта яшчэ не абыякавасць, гэта не пасіўнасць і не бяздзейнасць, не чаканне пагоды з Усходу і з Захаду. Гэта не прычына для таго, каб не мець «ні роду, ні люду». Якая ж будучыня бачыцца паэту? Усе дарогі, разважае аўтар, вядуць да канца, і ўсякае жыццё мае свой канец.

*Бо ўсё канчаецца вельмі проста.*
*Чатыры дошкі і сажань зямлі.*

Вельмі добра знітаваныя прастата і мудрасць. У такіх умовах, сцвярджае аўтар, кожны павінен бараніць свой працяг. У першую чаргу для паэта - гэта непрыныццё раўнадушша, здольнасць здзяйсняць свой выбар.

Паэма «Зязюля» - гэта твор мастацтва. Няхай гэта банальна, але гэта сапраўды ўзор формы і зместу. Даволі невялікая па аб'ёму паэма вылучаецца шматтэмнасцю і шматпраблемнасцю. Усё ў ёй служыць выяўленню зместу. Узяць хоць бы такую асаблівасць кампазіцыі, як падзел паэмы на 13 частак, кожная з іх нясе ў сабе адну з тэм паэмы. Чаму не сем, не дзесяць, не дванаццаць, а менавіта 13? Гэта лічба з д'ябальскім значэннем, лічба, якой баяцца. Трынаццаць адрэзкаў рэчаіснасці сімвалізуюць свет цёмнага, народжанага самым сатаной. Урэшце, 13 х 2 = 26. Страшная дата красавіка 1986 г.

# ВЫ ПРОСИЛИ РАССКАЗАТЬ

**По просьбам читателей и при содействии начальника планово-экономического отдела Г.В.Бородавко — а вопросов по зарплате более чем достаточно — публикуем в изложении приказ ректора «О дополнительных мерах по совершенствованию оплаты труда работников Гродненского государственного университета имени Янки Купалы».**

Во исполнение Постановления Совета Министров Республики Беларусь от 25 сентября 2000 года №1470 «О повышении размера минимальной заработной платы и тарифной ставки первого разряда»,

**приказываю:**

1.Ввести в действие с 1 октября 2000 года

1.1. Минимальную заработную плату в размере 3 600 рублей;

тарифную ставку 1-го разряда в размере 7 200 рублей.

1.2. Ежемесячные дифференцированные доплаты к тарифным ставкам и окладам, рассчитанным в соответствии с установленной Советом Министров Республики Беларусь тарифной ставкой 1-го разряда и коэффициентами ЕТС работников Республики Беларусь в следующих размерах:

| | | |
|---|---|---|
| с 1-го по 2-ой разряд | - | 6 500 рублей |
| свыше 2-го по 3-ий разряд | - | 5 800 рублей |
| свыше 3-го по 4-ый разряд | - | 5 000 рублей |
| свыше 4-го по 5-ый разряд | - | 4 000 рублей |
| свыше 5-го по 6-ой разряд | - | 3 300 рублей |
| свыше 6-го по 7-ой разряд | - | 2 700 рублей |
| свыше 7-го по 8-ой разряд | - | 2 000 рублей |
| свыше 8-го по 9-ый разряд | - | 1 100 рублей |
| свыше 9-го по 10-ый разряд | - | 500 рублей. |

1.3. Список наименования должностей согласно ЕТС прилагается на 12-ти листах.

1.4. Произвести перерасчет стипендий, исходя из нового размера минимальной заработной платы.

**Ректор С.А. Маскевич.**

## ПРИКАЗ

Во исполнение Постановления Министерства труда Республики Беларусь от 11.09.2000 года № 121 «О совершенствовании условий оплаты труда работников высших учебных заведений, финансируемых за счет средств бюджета», -

**приказываю:**

Установить с 1 июля 2000 года повышающие коэффициенты к должностным окладам отдельных категорий работников Гродненского государственного университета имени Янки Купалы, рассчитанным в соответствии с Единой тарифной сеткой:

1. Ректор - 1.4
2. Первый проректор, первый проректор по учебно-воспитательной работе и социальным вопросам, проректор по учебной работе, проректор по научной работе, декан, заместитель декана, заведующий кафедрой, профессор - 1.35
3. Доцент, зав. аспирантурой - 1.3
4. Старший преподаватель, преподаватель, ассистент, преподаватель — стажер, концертмейстер, аккомпаниатор (осуществляет подготовку работников искусств, учителей музыки и пения), младший научный сотрудник - 1.25

**Ректор С.А.Маскевич.**

## П Л А Н
## работы Савета універсітэта на 2000-2001 навучальны год

**Лістапад**

1. Праграма развіцця навуковай бібліятэкі універсітэта на 2001-2005 гады.

Дакл.: першы прарэктар па навучальна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях.

2. Рознае.

**Снежань**

1. Сістэма стратэгічнага і кароткачасовага планавання і кантролю ва універсітэце.

Дакл.: першы прарэктар.

2. Рознае.

**Студзень**

1. Аб выніках навукова-даследчай работы універсітэта за 2000 год і апошнюю пяцігодку.

Дакл.: прарэктар па навуковай рабоце.

2. Аб эфектыўнасці міжнароднага супрацоўніцтва універсітэта.

Дакл.: прарэктар па навучальнай рабоце.

3. Рознае.

**Люты**

1. Аб выніках работы універсітэта ў 2000 годзе і задачах на 2001-2005 год.

Дакл.: рэктар універсітэта.

2. Рознае.

**Сакавік**

1. Аб стане і перспектывах развіцця фізіка-тэхнічнага факультэта.

Дакл.: дэкан факультэта.

2. Рознае.

**Красавік**

1. Аб развіцці універсітэта як рэгіянальнага навуковага і культурнага цэнтра.

Дакл.: першы прарэктар па навучальна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях.

2. Рознае.

**Май**

1. Аб ролі кафедр як асноўных вучэбна-навуковых структурных падраздзяленняў універсітэта.

Дакл.: першы прарэктар.

2. Рознае.

**Чэрвень**

1. Аб рабоце аб'яднання кафедр сацыяльна-гуманітарных навук па ўдасканаленні вучэбна-выхаваўчага працэсу.

Дакл.: кіраўнік аб'яднання.

2. Рознае.

## УВАЖАЕМЫЕ СТУДЕНТЫ!

Центр электронных коммуникаций ГрГУ совместно с профкомом студентов, аспирантов и магистрантов проводит подключение к глобальной сети Internet для студентов, магистрантов и аспирантов очной и вечерней форм обучения.

Условия подключения:

1. Подключение осуществляется с помощью соединения dial-up (через модем и телефонную линию).

2. Целью данного проекта является использование сети Internet в образовательных целях.

3. Пользователь платит не за провайдерские услуги, а за использование технической базы ГрГУ.

4. За счет взносов пользователей расширяется техническая база Центра электронных коммуникаций ГрГУ, которая обслуживает соединения типа dial-up.

5. Скорость доступа ограничивается пропускной скоростью телефонной линии (для аналоговых линий это примерно 33Kb)

6. Дозвон осуществляется на цифровой номер.

7. Используется корпоративный аккаунт от «Европа-Online».

8. Фильтры практически те же самые, что и в локальной сети ГрГУ.

9. Пользователь, замеченный в частой смене номеров, с которых осуществляется дозвон, отключается от сети без возврата взносов.

10. Доступ unlimited (неограниченный).

11. Подключается 5 человек на один модем.

12. В сутки пользователь имеет три часа приоритетного времени, остальные соединения осуществляются при наличии свободной линии.

***По интересующим Вас вопросам обращаться в профком студентов ГрГУ (ауд. 229, гл. корпус, Ожешко, 22, тел. 44-50-54).***

# СПОРТИВНЫЙ КАЛЕЙДОСКОП

**РУБРИКУ ВЕДЕТ СТАРШИЙ ПРЕПОДАВАТЕЛЬ КАФЕДРЫ ФИЗВОСПИТАНИЯ О. СМОЛЯКОВ**

## НАШИ ОЛИМПИЙЦЫ — МОЛОДЦЫ!

На XXVII Олимпийских играх в австралийском Сиднее в составе сборной команды нашей страны были четверо студентов и двое выпускников факультета физической культуры нашего университета. Лучший результат показал выступавший в греко-римской борьбе Валерий Циленць в весовой категории до 85 кг. Он занял четвертое место. Шестое место по гребле на байдарке в финальном заплыве заняли Елена Беть и Светлана Вакула. Девятый результат у стрелка-пистолетника Константина Лукашика, десятое место у метательницы молота Светланы Судак, двадцатое место у Ирины Шиловой в пулевой стрельбе из винтовки.

## СПАРТАКИАДА

### ГРОДНЕНСКОГО ГОСУДАРСТВЕННОГО УНИВЕРСИТЕТА

### 1999/2000 УЧЕБНОГО ГОДА

| Вид спорта | Осен. кросс | | Мини-футбол | | Шах-маты | | Плава-ние | | Гимнас-тика | | Волейбол | | | | Баскетбол | | | | Весен. кросс | | Легкая атлетика | | Очки | Место |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Факультет | М | О | М | 0 | М | О | М | 0 | М | 0 | муж. | | жен. | | жен. | | муж. | | М | 0 | М | 0 | | |
| | | | | | | | | | | | М | 0 | М | 0 | М | 0 | М | 0 | | | | | | |
| 1. Математический | V | 5 | III | 3 | II | 2 | IV | 4 | V | 5 | III | 3 | V | 5 | V | 5 | VII | 7 | IV | 4 | IV | 4 | 30 | III |
| 2.Юридический | III | 3 | V | 5 | III | 3 | II | 2 | II | 2 | II | 2 | IV | 4 | IV | 4 | II | 2 | I | 1 | II | 2 | 17 | II |
| 3.Физико-технический | VII | 7 | VI | 6 | I | 1 | III | 3 | IV | 4 | V | 5 | VII | 7 | VII | 7 | III | 3 | VI | 6 | VI | 6 | 34 | V |
| 4. Истории и культуры | VI | 6 | IV | 4 | VIII | 8 | V | 5 | VI | 6 | IV | 4 | VIII | 8 | VIII | 8 | I | 1 | VIII | 8 | VII | 7 | 41 | VII |
| 5.Биологии и экологии | VIII | 8 | II | 2 | — | 11 | VI | 6 | VII | 7 | VIII | 8 | VI | 6 | VI | 6 | VIII | 8 | V | 5 | VIII | 8 | 48 | VIII |
| 6. Экономики и управления | I | 1 | I | 1 | IV | 4 | I | 1 | I | 1 | I | 1 | III | 3 | III | 3 | IV | 4 | II | 2 | I | 1 | 11 | I |
| 7.Филологический | IV | 4 | VIII | 8 | V | 5 | VII | 7 | III | 3 | VI | 6 | II | 2 | II | 2 | VI | 6 | VII | 7 | III | 3 | 31 | IV |
| 8.Педагогики и психологии | II | 2 | — | 11 | VII | 7 | — | 11 | VIII | 8 | — | 11 | I | 1 | I | 1 | IX | 9 | III | 3 | V | 5 | 36 | VI |
| 9. Гуманитарный | — | 11 | VII | 7 | VI | 6 | — | 11 | — | 11 | VII | 7 | — | 11 | — | 11 | V | 5 | — | 11 | — | 11 | 69 | IX |

**КОММЕНТАРИЙ**

Завершились соревнования круглогодичной студенческой спартакиады университета 1999-2000 учебного года. Уверенную победу в общекомандном зачете одержали студенты факультета экономики и управления (декан факультета Белых Ю.Э., руководитель физвоспитания Малышко Т.Н.). Студенты этого факультета завоевали шесть первых мест, одно второе, два третьих и два четвертых.

Вторыми стали юристы (декан факультета Веленто И.И., руководитель физвоспитания Кудель А.А.), третье место у математиков (декан факультета Бойко В.К., руководитель физвоспитания Боярчук И.Л.).

## НОВЫЙ ЧЕМПИОН

С 16 по 24 октября проводилось первенство университета по мини-футболу. Соревнованиям предшествовала большая кропотливая работа сборных команд факультетов.

В соревнованиях участвовали 8 факультетов: экономики и управления, математический, юридический, физико-технический, истории и культуры, биологии и экологии, гуманитарный, филологический. За сборные команды факультетов выступали лучшие спортсмены: Дмитрий Доля, Игорь Плышевский (юридический факультет), Юрий Юшкевич (филологический факультет), Иван Мухин, Александр Воронцов (физико-технический факультет), Виталий Севостьяник, Павел Шапель, Дмитрий Ровнейко (факультет экономики и управления).

Соревнования проводились в течение семи дней по круговой системе. После трех дней соревнований стало ясно, что основные претенденты на звание чемпионов университета — команды следующих факультетов: юридического, экономики и управления, истории и культуры, биологии и экологии. Между ними развернулась упорная борьба. Под пристальным глазом руководителя физического воспитания В.А.Иванова и при активной помощи болельщиков команде факультета истории и культуры удалось сломить сопротивление соперников и одержать достойную победу и завоевать звание чемпиона университета. Победители показали содержательную, темпераментную, бескомпромиссную, порой жесткую игру.

Историки победили команды факультета экономики и управления (3:0), математического (3:1), физико-технического (2:1), биологии и экологии (2:1), филологического (3:1), гуманитарного (5:1) и проиграли только юристам (1:6). Чемпионами стали: Юрий Борисенко, Владимир Чаплюк, Андрей Амбражевич, Дмитрий Конюшевский, Виталий Корень, Юрий Пузыня, Александр Гагалушко, Евгений Рудко, Алексей Яковчик. Поздравляем!

Второе место заняла дружная команда юридического факультета (руководитель А.А.Кудель). Третье место досталось команде факультета экономики и управления (руководитель Т.И. Малышко). Победители награждены дипломами и призами.

## ПЕРВАЯ ПОБЕДА ФИЛОЛОГОВ

В ясный погожий день «бабьего лета» в лесном массиве «Пышки» состоялись соревнования по легкоатлетическому кроссу в программе круглогодичной спартакиады университета 2000-2001 учебного года.

На торжественном открытии состязаний участников приветствовал начальник отдела по воспитательной работе Г.Кобяк.

Затем начались забеги. Девушки соревновались на дистанции 500 метров, юноши - 1000 метров.

194 юноши и 187 девушек боролись за победу в личном первенстве и за командную победу. После финиша пятого забега, где участвовали сильнейшие спортсмены университета, определились победители и призеры. У девушек победительницей стала студентка юрфака Наталья Кейко. 1.30,1 - ее победный результат. На втором месте Елена Пушко (факультет педагогики) - 1.32,5, на третьем - Валентина Василевская (факультет психологии) - 1.34,6.

У юношей вне конкуренции был филолог Юрий Юшкевич - 2.23,8 сек, на вторую ступень пьедестала почета поднялся Илья Анисимов (факультет экономики и управления) - 2.45,5, на третьем - будущий юрист Игорь Плышевский - 2.48,3.

В общекомандном зачете победу праздновали филологи (декан факультета Церлюкевич В.К., руководитель физвоспитания Михайлов В.П.). Кубок за победу получил годичную прописку на филологическом факультете, впервые в истории проведения кроссов.

Призовые места завоевали спортсмены юридического факультета (декан Веленто И.И., руководитель физвоспитания Кудель А.А.) и будущие математики (декан Бойко В.К., руководитель физвоспитания Боярчук И.Н.).

Далее места распределились в следующем порядке: факультет экономики и управления, факультет педагогики, физико-технический факультет, факультет истории и культуры, факультет биологии и экологии, факультет психологии.

Одновременно проходил конкурс среди студентов-первокурсников на кубок серебряного призера Олимпиады-80 по спортивной ходьбе Петра Починчука.

В командном зачете первое место завоевали филологи, на втором месте - математики, на третьем - юристы. Далее идут историки, физико-технический факультет, факультеты педагогики, биологии, психологии и экономики.

# ВОСЕНЬСКІЯ МАТЫВЫ

## ПА СТАРОНКАХ ЛІТАРАТУРНАГА АБ'ЯДНАННЯ «НАДНЁМАНСКІЯ ГАЛАСЫ»

*Ганна ШАКАЛЕЙ*

Чароўны момант лёгкага
падзення
З галінкі дрэва жоўтага
лістка...
Праносіць думку у адно
імгненне
Аб тым, што недалёка і
зіма.
Абступіць цішыня сівым
туманам,
За вокнамі пачнуць гуляць
вятры.
І панясуцца думкі нечакана
Ў чароўны свет - да будучай
вясны.
**1991г.**



*Васіліса ПАЗНУХОВА*

Лагодны восеньскі дзянёк
Рассыпаў у вышыні аблокі
І сарамліва, незнарок
Кранае сонцам лісця шчокі.
І сумна трохі мне чагось,
І радасць светлая навокал.
А восень, як жаданы госць
Зрабіла небасхіл шырокім.
І думкі птушкамі плывуць
Удалячынь за лес зялёны,
У край, які не дасягнуць,
У шлях, нікому не знаёмы.
Вяргіня палкая цвіце
Пунцовым полымем адчайна,
І павуцінне на траве
Як быццам з казкі
незвычайнай.
**1996 г.**





### РЕДАКЦИЯ ГАЗЕТЫ

**«Гродзенскі універсітэт» от имени своих читателей благодарит сотрудников лаборатории мультимедиа ВЦ за техническое содействие в выпуске этого номера газеты.**

*Святлана САЛЯНСКАЯ*

**ТРЫЯЛЕТЫ ВОСЕНІ**

I.
Маўкліва акіну паглядам,
Як вецер лістоту адносіць,
Як дрэвы глядзяцца ў
просінь,
Маўкліва акіну паглядам.
Як быццам аб нечым нас
просіць
Халодная, шэрая восень.
Маўкліва акіну паглядам,
Як вецер лістоту адносіць.
II.
Як восень жоўтаю ладдзёй
Нябачна шчасце прамільгнула,
Хоць яркім полымем
шугнула,
Ды не пакінула надзей.
Яго б назад я не вярнула,
Нашто мне цень былых
падзей...
Як восень, жоўнаю ладдзёй
Нябачна шчасце прамільгнула.
**1996 г.**

*Юры КАРЭЙВА*

**ТЫ НЕ СУМУЙ**

Рукой кранае дрэвы восень -
Маўкліва падаюць лісты...
Шмат што між намі
не збылося,
Ды не сумуй аб гэтым ты.
Няхай наўкола дагарае
Агонь апошні ў фарбах
дрэў,
Ды не сумуй ты, дарагая,
Што нас з табой ён
не сагрэў.
Ты не сумуй, што, як хацелі,
Не ўсё з табою выйшла
ў нас.
Ты не сумуй. Хай восень
сцеле
Вакол лісты - такі ўжо час...
Але не час нам на
расстане.
Хай лёс даўно нас разлучыў -
Наш лепшы час, павер,
настане
І не сумуй ты ні аб чым...
**1991 г.**



**Фотаэцюды Людмілы ВОЙДЫ.**



*Рэдактар* **Людміла Мікалаеўна ДАНІЛАВА**

*Заснавальнік: Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы.*
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 519.
Газета набрана, звярстана і надрукавана на тэхніцы выдавецкага аддзела Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы.
ЛП № 111 ад 29.12.97 г.
Вул. Ажэшкі, 22, 230023, г. Гродна.

*Набор і вёрстка:*
**М. ВЕРСТАК, І. ЗІМНІЦКАЯ.**
*Карэктура:*
**Н. ДУДКО.**

*Здадзена ў набор 12.10.2000.*
*Падпісана да друку: 02.11.2000. 15.00*
*Заказ № 326*
Аб'ём - 1 ум. друк. арк.
Наклад 500 асобнікаў.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў адказваюць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытатаў, эканамічных даных, асабістых імёнаў, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара.

*Наш адрас:* 230023, г.Гродна, вул. Ажэшкі, 22, пакой 228. ☎ 72-08-17.